Голас Радзімы

№ 3 (1729)
21 студзеня 1982 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.



Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі АН БССР кандыдат фізіка-матэматычных навук Барыс Джагараў атрымаў першую прэмію інстытута за работы апошніх год. Раней ён быў удастоены прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Вучоны мае значны навуковы стаж і ўзначальвае групу, якая вывучае працэсы ў малекулах хларафілу і гемаглабіну. Пад яго кіраўніцтвам двое калег падрыхтавалі кандыдацкія дысертацыі.

НА ЗДЫМКУ: Барыс ДЖАГАРАЎ.

Фота В. ДРАЧОВА.

ЗАЯВА ТАСС

ЗША і іх саюзнікі па НАТО працягваюць спробы грубага ўмяшання ва ўнутраныя справы суверэннай дзяржавы — Польскай Народнай Рэспублікі, нагнятання міжнароднай напружанасці. Гэта выявілася з усёй відавочнасцю і ў заяве, апублікаванай 11 студзеня міністрамі замежных спраў краін Паўночнаатлантычнага саюза.

Добра вядома, што ініцыятарам усяго гэтага ганебнага фарса з'яўляецца адміністрацыя ЗША. Яе почырк адчуваецца і ў беспардонным скажэнні фактаў, і ў бесцырымоннасці тону, і ў празмерных палітычных амбіцыях.

На якой падставе Вашынгтон прысвойвае сабе права дыктаваць другой дзяржаве, як яна павінна вырашаць свае ўнутраныя справы, прад'яўляць нейкія патрабаванні польскаму кіраўніцтву? Інакш, як здзекамі над самымі свяшчэннымі нормамі міждзяржаўных адносін і міжнароднага права, гэта не назавеш.

Больш чым паказальна, што гэта робяць іменна тыя, хто ўтоптвае ў гразь элементарныя чалавечыя правы і свабоды ва ўласных краінах, хто яўна і тайна спрабуе задушыць любую спробу народаў самім вызначаць свой лёс. Чылі, Дамініканская Рэспубліка, Сальвадор — толькі асобныя прыклады.

А хіба не ясна, за чыю спіну хаваецца ізраільскі агрэсар, які на вачах усяго свету анексіруе спрадвечныя арабскія тэрыторыі, спрабуе патапіць у крыві барацьбу палесцінскага народа за сваю свабоду і нацыянальнае існаванне. Гэта зноў-такі ЗША, а таксама тыя з іх сяброў, якія спрабуюць узяць на сябе ролю памочнікаў самазваных суддзяў, якія прадпісваюць палякам, як ім трэба сябе паводзіць.

Аўтары натаўскай заявы не ўтойваюць, што іх не задавальняе працэс нармалізацыі ў сацыялістычнай Польшчы, які пачаўся ў выніку мер, прынятых польскімі ўладамі ў адпаведнасці з канстытуцыяй краіны. Іх прыводзіць у шаленства тое, што было прадухілена набліжэнне небяспекі грамадзянскай вайны, нацыянальнай катастрофы ў Польшчы.

Не хто іншы, як адміністрацыя ЗША, якая крывадушна заклікае цяпер да «нацыянальнага прымірэння» ў Польшчы, рабіла і робіць усё для таго, каб такога прымірэння не было, каб сітуацыя там развівалася ў прама процілеглым напрамку.

ЗША па-ранейшаму спрабуюць усяляк заахвочваць антысацыялістычныя сілы ў Польшчы, падштурхоўваць іх да парушэння правапарадку, звяржэння існуючага там ладу. Рабілася і робіцца гэта ў розных формах і рознымі шляхамі — ад злачынна-падрыўной дзейнасці спецслужбаў, падбухторшчыцкіх радыёперадач, якія шчодра субсідзіруюцца з амерыканскай казны, інструкцый па радыё да афіцыйных заяў Белага дома.

Цяпер, калі абстаноўка ў Польшчы паступова стабілізуецца, калі людзі ўздыхнулі свабодней, пачаў наладжвацца працоўны вытворчы рытм, ЗША спрабуюць перашкодзіць гэтаму, звяртаючыся да эканамічных і іншых санкцый у адносінах да Польшчы, падцягваюць да гэтай авантурыстычнай лініі сваіх саюзнікаў па НАТО.

Усё гэта з'яўляецца недапушчальным націскам на незалежную польскую дзяржаву, націскам, несумяшчальным з духам і літарай Статута ААН, з хельсінкскім Заключным актам, з элементарнымі нормамі міжнародных зносін.

Крывадушныя разважанні аб «правах чалавека» не могуць затушаваць таго факта, што ЗША і некаторыя іншыя краіны НАТО толькі ўскладняюць той цяжар, які прынесла палякам дзейнасць сіл контррэвалюцыі, што натхняецца і падтрымліваецца звонку.

ЗША і іх саюзнікі па НАТО не спыняюцца ў сваёй заяве перад прамой фальсіфікацыяй фактаў, якія адносяцца да таго, што адбываецца ў Польшчы. Але колькі б ашуканства ні нагрувашчвалася ў гэтай заяве, гэта не надае пераканаўчасці палітыцы ўмяшання ва ўнутраныя справы іншых дзяржаў.

Цяпер яшчэ відней, якія надзеі звязвалі пэўныя знешнія колы з дзейнасцю контррэвалюцыйных сіл у Польшчы. Разлік быў просты: разбурыць польскую сацыялістычную дзяржаву, рэстаўрыраваць буржуазныя парадкі. Выкарыстоўваючы трапную прымаўку, якая бытуе ў многіх народаў, можна сказаць арганізатарам змовы супраць народнай Польшчы: не бачыць ім ажыццяўлення гэтых задум як сваіх вушэй.

Імкнучыся хоць неяк апраўдаць сваё нахабнае ўмяшанне ў польскія справы, краіны НАТО вар'іруюць на розныя лады версію, быццам ваеннае становішча ў Польшчы было ўведзена пад націскам СССР і іншых сацыялістычных краін і што нагул Савецкі Саюз нібыта мае дачыненне да цяперашняга развіцця абстаноўкі ў Польшчы. Гэта выдумка ад пачатку да канца.

Ажыццяўляемыя вышэйшымі органамі Польшчы меры — гэта польскае нацыянальнае рашэнне, гэта справа палякаў і толькі іх. Што можа быць больш аўтарытэтным, чым заявы наконт гэтага польскага кіраўніцтва?

Павінна быць ясна разам з тым, што Савецкаму Саюзу не абыякавы лёс суседняй сацыялістычнай Польшчы. Сотні тысяч савецкіх людзей аддалі жыццё пры вызваленні Польшчы ад фашысцкага рабства, і гэтага не згладзіць з памяці ні савецкага, ні польскага народаў. Між тым добра вядома, што ніводзін амерыканец не загінуў на польскай зямлі за вызваленне Польшчы.

Польшча, як неаднаразова падкрэслівалі яе кіраўнікі, была і застанецца непарушным звяном Варшаўскага Дагавора, членам сацыялістычнай садружнасці. З гэтага павінны зыходзіць усе, хто замахваецца на сацыялістычную польскую дзяржаву.

Верны саюзу з брацкай Польшчай, СССР аказваў і будзе аказваць польскаму народу дапамогу і падтрымку. Дапамога гэта знаходзіцца ў яркім кантрасце з дзеяннямі ЗША, якія дзеля сваіх імперыялістычных мэт хацелі б асудзіць польскі народ на пакуты і галечу.

Брусельская сесія Савета НАТО зноў паказвае, што гэты агрэсіўны ваенны блок выкарыстоўваецца і як механізм для навязвання заходнееўрапейцам чужой іх нацыянальным інтарэсам волі заакіянскага партнёра.

Так, Вашынгтон прыкладае нямала намаганняў, каб перавесці стрэлкі міжнароднай палітыкі са шляху разрадкі на шлях міжблокавай канфрантацыі. Навошта гэта робіцца? Адказаць на гэта пытанне не так ужо цяжка.

Перш за ўсё гутарка ідзе аб спробе пацясніць сацыялізм, пахіснуць пазіцыі СССР і іншых сацыялістычных краін на еўрапейскай і сусветнай арэне. Іншых дзеячаў імперыялістычнага лагера і ўдзень і ўначы літаральна апаноўваюць кашмары ад таго, што сацыялізм умацоўваецца. Міжнародныя пазіцыі сацыялізму апіраюцца на існуючыя суадносіны сіл у Еўропе і ў свеце, гарантуюцца магутнасцю сацыялістычнай садружнасці.

Штучна драматызуючы сітуацыю вакол Польшчы і нагнятаючы напружанасць, у Вашынгтоне яўна паставілі сабе мэту яшчэ больш атруціць агульны палітычны клімат, пагоршыць атмасферу для дыялога паміж Усходам і Захадам. Як відаць, паслядоўны курс Савецкага Саюза, іншых краін сацыялізму на перагаворы, на згортванне гонкі ўзбраенняў, на пошук узаемапрымальных рашэнняў наспеўшых праблем сур'ёзна перашкаджае ажыццяўленню разбухшых ваенных праграм ЗША, планаў размяшчэння ў Заходняй Еўропе новых амерыканскіх ядзерных ракет.

Не выпадкова ў брусельскай заяве НАТО змяшчаюцца намёкі на тое, што, калі справы ў Польшчы будуць развівацца не так, як хацелася б таму-сяму ў НАТО, то ЗША могуць пайсці на блакіраванне перагавораў па важнейшых пытаннях, уключаючы праблему абмежавання ўзбраенняў.

Наконт гэтага неабходна сказаць адно. Тыя, хто звяртаецца да такіх пагроз, павінны б засвоіць простую ісціну: спыненне гонкі ўзбраенняў, прадухіленне вайны, перш за ўсё ядзернай, трэба капіталістычным краінам не менш, чым Савецкаму Саюзу і яго сябрам, зразумела, калі ўсур'ёз, па-сапраўднаму клапаціцца аб будучым, а не прыпадабняцца да азартных ігракоў, гатовых усё паставіць на карту і рынуцца з завязанымі вачыма ў бездань. Але ў гэтым выпадку стаўкамі былі б лёс і само жыццё народаў, усяго чалавецтва.

Ніякая варожасць да сацыялізму як грамадскага ладу не можа, не павінна засланяць праблем вайны і міру, спынення гонкі ўзбраенняў і перш за ўсё ракетна-ядзерных. Разбураць аснову перагавораў па гэтых праблемах, вырашэння якіх чакаюць народы, азначала б узяць на сябе цяжкую адказнасць.

Савецкі Саюз, іншыя сацыялістычныя краіны — за працяг і ўмацаванне разрадкі і міру на еўрапейскім кантыненце і ў свеце ў цэлым. Яны праводзяць і нязменна будуць праводзіць гэту палітыку.

падзеі • людзі • факты

ВІНШАВАННЕ КІРАЎНІКА ДЗЯРЖАВЫ

Будаўнікі, мантажнікі, эксплуатацыйнікі — усе ўдзельнікі будаўніцтва прадпрыемстваў Міністэрства лёгкай прамысловасці Беларускай ССР атрымалі выдатную працоўную перамогу, паспяхова выканаўшы сацыялістычныя абавязацельствы 1981 года па датэрміновому ўводу ў дзеянне вытворчых магутнасцей на прадпрыемствах лёгкай прамысловасці.

У рэспубліцы з апераджэннем устаноўленых тэрмінаў здадзены ў эксплуатацыю магутнасці на прадзільна-ткацкай фабрыцы ў Кобрыне, у Брэсцкім вытворчым дыванова-суконным аб'яднанні, на швейных фабрыках у Салігорску і Оршы, Дубровенскім і Ашмянскім ільнозаводах.

З гэтай нагоды будаўнікоў, мантажнікаў, эксплуатацыйнікаў сардэчна павіншаваў Генеральны сакратар ЦК КПСС, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнеў.

Кіраўнік Савецкай дзяржавы гэту працоўную перамогу ацаніў як істотны ўклад у паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXVI з'езда КПСС па далейшаму павелічэнню выпуску тавараў народнага спажывання, павышэнню дабрабыту савецкіх людзей.

«Выказваю ўпэўненасць, — падкрэсліў Л. І. Брэжнеў, — што ваш прыклад мабілізацыі сіл і сродкаў на датэрміновае выкананне заданняў па збудаванню аб'ектаў лёгкай прамысловасці паслужыць паспяховаму выкананню планаў адзінаццатай пяцігодкі».

ЮБІЛЕЙ УНІВЕРСІТЭТА

За поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў і вялікі ўклад у развіццё навукі і культуры Беларускі дзяржаўны універсітэт узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. У 51 нумары «Голасу Радзімы» за 1981 год мы паведамлялі, што Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту споўнілася 60 гадоў.

Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР узнагароджаны многія работнікі БДУ. Сярод іх дэкан факультэта Аляксей Волк, загадчыца склада Вольга Клімовіч, прафесар Васіль Пыжкоў, старшы лабарант Ягор Піскуноў, вадзіцель аўтамабіля Мікалай Раманаў і іншыя.

Шэрагу работнікаў універсітэта прысвоены ганаровыя званні Беларускай ССР. Званне заслужанага дзеяча навукі Беларускай ССР удастоены загадчыкі кафедр Рафаіл Габасаў, Іван Цішчанка, Павел Шуба. Іншыя атрымалі ганаровыя званні заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі Беларускай ССР, заслужанага работніка вышэйшай школы Беларускай ССР, заслужанага настаўніка Беларускай ССР, заслужанага работніка культуры Беларускай ССР.

ГІДРАЎДАРНАЯ ШТАМПОЎКА

У Фізіка-тэхнічным інстытуце АН БССР распрацаваны тэхналогія і абсталяванне для гідраўдарнай штампоўкі металічных вырабаў. Вартасці метаду заключаюцца ў магчымасці атрымання аб'ёмных дэталей складанай канфігурацыі пры добрай якасці паверхні. Абсталяванне ўкаранёна на Мінскім аўтазаводзе, у ленінградскім навукова-вытворчым аб'яднанні «Буравеснік» і на іншых заводах краіны.

МІМА СКЛАДА — ДА ПРЫЛАЎКА

Распрацоўку кантэйнернай сістэмы ўпакоўкі і пагрузкі яек, якая будзе ўкаранёна ў Мінскім вытворчым аб'яднанні па птушкагадоўлі, завяршылі гомельсакія канструктары. Патрэба ў такой сістэме на галаўным прадпрыемстве аб'яднання — птушкафабрыцы імя Н. Крупскай — асабліва ўзрасла з пускам тут першага ў краіне «птушніка-магазіна». Зблакіраваўшы чатыры побач размешчаныя памяшканні транспарцёрамі, на фабрыцы атрымалі магчымасць усю прадукцыю, якая сарціруецца і маркіруецца цяпер проста на канвееры, адпраўляць непасрэдна ў гандлёвую сетку, мінаючы склады.

Новая сістэма прадугледжвае аўтаматычную ўпакоўку прадукцыі ў металічныя кантэйнеры, кожны з якіх заменіць па ўмяшчальнасці амаль дзесяць ранейшых скрынь, і пагрузку іх на машыны пры дапамозе спецыяльных пад'ёмнікаў. У бягучай пяцігодцы ў аб'яднанні намечана стварыць яшчэ дзесяць птушнікаў-магазінаў.

ПАЗВАНІЦЕ... КАМП'ЮТЭРУ

З дасягненнямі навукі, тэхнічнымі навінкамі, перадавым вопытам пазнаёміць спецыялістаў камп'ютэр інстытута «Сельгастэхпраект» Дзяржкамсельгастэхнікі БССР. Укаранёная тут інфармацыйна-пошукавая сістэма здольна выдаць цэлыя рэфераты па навейшай тэхналогіі вырошчвання сельскагаспадарчых культур, расказаць аб рацыянальных прыёмах выкарыстання машын на сяўбе і ўборцы... У «памяць» ЭВМ закладзена 90 тысяч самых розных даведак па раздзелах: новая тэхніка, матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, рамонт і абслугоўванне, механізацыя ў жывёлагадоўлі, эканоміка і арганізацыя вытворчасці.

Самае маладое прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 141 у Гродна рыхтуе кваліфікаваных рабочых васьмі спецыяльнасцей для прамысловых прадпрыемстваў горада. Сёлета тут адбудзецца першы выпуск.

Больш тысячы юнакоў і дзяўчат займаюцца ў гэтай навучальнай установе. Яны набываюць прафесіі токара, фрэзероўшчыка, шліфавальшчыка, наладчыка радыёапаратуры. У вучылішчы створаны ўсе ўмовы для паспяховай вучобы і адпачынку. Да паслуг навучэнцаў выдатна абсталяваныя кабінеты і майстэрні, спартыўная зала, бібліятэка, прасторная сталовая.

НА ЗДЫМКУ: вучэбны корпус і інтэрнат вучылішча.

ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ГАРАНТЫІ Ў ВЫТВОРЧАЙ І САЦЫЯЛЬНАЙ СФЕРАХ

КАЛГАСНІК І «СЕЛЬСКІ» ПРАФСАЮЗ

На агульным фоне актывізацыі прафсаюзнай дзейнасці ў СССР «сельскі» прафсаюз ставіць своеасаблівыя рэкорды. У прыватнасці, за апошнія пяць гадоў у яго ўступілі амаль 9 мільёнаў чалавек. І цяперашняе папаўненне складаюць у асноўным члены сялянскіх кааператываў (калгасаў), якія ў адрозненне ад работнікаў дзяржаўных аграрных гаспадарак (саўгасаў) сталі актыўна ўступаць у прафсаюз толькі ў апошнія 10—15 гадоў. Да сярэдзіны 60-х гадоў у большасці калгасаў не было прафсаюзных арганізацый, а традыцыйна прафсаюзныя пытанні вырашаліся на агульных сходах.

Па меры ўзбуйнення і індустрыялізацыі гэтых гаспадарак змяніліся ўмовы працы і жыцця калгаснікаў, у прыватнасці, былі ўведзены нарміраваны рабочы дзень і цвёрдая грашовая аплата. Калгаснікі пачалі ствараць прафсаюзныя арганізацыі.

Што дае калгаснікам членства ў прафсаюзе?

Перш за ўсё дадатковыя гарантыі ў вытворчай і сацыяльнай сферах. Праз прафсаюзныя камітэты і іх камісіі сяляне атрымалі больш шырокі доступ да планавання і кіравання вытворчасцю, да непасрэднага вырашэння пытанняў сацыяльнага развіцця калектыўных гаспадарак, паляпшэння ўмоў працы, расходавання фондаў матэрыяльнага заахвочвання, падрыхтоўкі кадраў і павышэння кваліфікацыі, жыллёвага і бытавога будаўніцтва, арганізацыі адпачынку.

Цэнтралізацыя ў руках прафсаюза сродкаў, вылучаемых калгасамі на сацыяльныя патрэбы, садзейнічала паляпшэнню сацыяльнага страхавання сялян. Не робячы ніякіх папярэдніх узносаў, калгаснікі, таксама як і рабочыя саўгасаў, сталі атрымліваць дапамогу па хваробе, цяжарнасці і родах, пенсіі па ўзросту і інваліднасці, карыстацца датацыямі на санаторна-курортнае лячэнне ў адпускны час і на адпачынак для членаў сваіх сямей.

Прафсаюз, зразумела, гарантуе сваім членам ахову іх працоўных і сацыяльных інтарэсаў. Прафсаюзная інспекцыя, напрыклад, кантралюе ў гаспадарках захаванне працоўнага заканадаўства, тэхніку бяспекі і ахову працы. Мясцовыя прафсаюзныя камітэты ўдзельнічаюць у разглядзе працоўных спрэчак, дабіваюцца задавальнення патрэб і запатрабаванняў калгаснікаў, у прыватнасці, праз заключаемыя з праўленнямі калгасаў пагадненні па сацыяльных пытаннях. Калі той або іншы кіраўнік не выконвае сваіх абавязкаў, прафсаюз мае права аштрафаваць яго, запатрабаваць паніжэння, а то і звальнення з пасады.

Пытанням, якія вырашае «сельскі» прафсаюз, была ўдзелена значная ўвага на XXVI з'ездзе КПСС. Прынятая з'ездам сацыяльна-эканамічная праграма развіцця краіны на 80-я гады прадугледжвае далейшае павелічэнне сельскагаспадарчай вытворчасці, паляпшэнне ўмоў працы і быту сялян. У новым пяцігоддзі (1981—1985 гады) на вёсцы адбудуцца істотныя пераўтварэнні. На развіццё вытворчай і сацыяльнай сферы асігнуецца каля 170 мільярдаў рублёў — амаль трэць усіх капітальных укладанняў у народную гаспадарку СССР. Гэта дазволіць не толькі павялічыць удвая ў параўнанні з дзесятай пяцігодкай прырост сельскагаспадарчай прадукцыі, але і зрабіць сялянскую працу больш прадукцыйнай і прывабнай.

Што ж датычыць мер сацыяльнага характару, то яны накіраваны на ліквідацыю існуючай пакуль дыспрапорцыі ва ўзроўні даходаў і ўмоў жыцця сельскага і гарадскога насельніцтва. У прыватнасці, намечаны паскораны рост заработнай платы калгаснікаў (на 20—22 працэнты) у параўнанні з рабочымі і служачымі (13—16 працэнтаў), гарантаваны аплатны водпуск не ніжэй за мінімальны ў прамысловасці, прадугледжаны апераджаючыя тэмпы будаўніцтва на вёсцы жылля, дзіцячых садоў, клубаў, школ, спартыўных збудаванняў, аб'ектаў сферы паслуг.

У вырашэнні вострых праблем на вёсцы многае можа зрабіць прафсаюз. А такіх праблем нямала, прычым усе яны ўзаемазвязаны. Напрыклад, больш цяжкія, чым у прамысловасці, умовы працы, недахоп добраўпарадкаванага жылля і ўстаноў культуры выклікаюць адток насельніцтва — у асноўным моладзі — у горад. Гэта пазбаўляе сяло патрэбных яму рабочых рук, адбіваецца на прадукцыйнасці працы.

XXVI з'езд КПСС падкрэсліў неабходнасць комплекснага вырашэння гэтых праблем, іншымі словамі, аб'яднання намаганняў калгасаў і саўгасаў з прадпрыемствамі і арганізацыямі, якія канструююць і выпускаюць сельскагаспадарчую тэхніку, забяспечваюць перапрацоўку, захоўванне і транспарціроўку прадукцыі, вядуць на вёсцы вытворчае і бытавое будаўніцтва. Вялікія магчымасці ў вырашэнні гэтых задач мае і наш прафсаюз.

Напомню, што згодна закону, нашы прадстаўнікі ўдзельнічаюць у прыёмцы ў эксплуатацыю новай тэхнікі і вытворчых аб'ектаў — без іх візы акт аб прыёмцы несапраўдны. Значыць, мы можам і павінны рабіць больш актыўны ўплыў на якасць машын і механізмаў з пункту гледжання іх бяспекі і рабочага камфорту, дабівацца паляпшэння вытворчых умоў.

У вырашэнні праблем жылля і быту, павышэння ўзроўню жыцця сялян асноўную ролю ў адзінаццатай пяцігодцы адыграюць нашы калектыўныя пагадненні з адміністрацыяй гаспадарак. Пры іх распрацоўцы і заключэнні акцэнт будзе рабіцца, у прыватнасці, на тыпах жылля, якія больш задавальняюць сялян — прысядзібны дом, катэдж з участкам зямлі і падсобнай гаспадаркай. Распрацаваныя ў апошні час дзяржавай і прафсаюзамі меры па індывідуальнаму жыллёваму будаўніцтву прадугледжваюць ільготныя ўмовы крэдытавання: будучы гаспадар дома ўносіць першапачаткова 20 працэнтаў яго кошту, яшчэ 30 працэнтаў выплачвае на працягу дваццаці гадоў, а палавіну расходаў пакрывае калгас або саўгас.

Больш, чым раней, у калектыўных пагадненнях будзе ўдзелена ўвагі асабістым падсобным гаспадаркам. Прафсаюз мае намер дабівацца, каб сельскім жыхарам паўсямесна аказвалася дапамога ў апрацоўцы ўчасткаў, забеспячэнні палівам, інвентаром, зернем і фуражом для адкорму жывёлы і птушкі, у рэалізацыі лішкаў прадукцыі на гарадскіх рынках і да т. п.

Яшчэ адзін істотны рэзерв — сацыяльныя фонды калгасаў (адлічэнні ад прыбытку), у размеркаванні якіх удзельнічае прафсаюз. У новым пяцігоддзі гэтыя сродкі будуць больш шырока выкарыстоўвацца на ўтрыманне дзіцячых садоў і ясляў,падрыхтоўку кадраў і культурна-асветніцкую работу, будаўніцтва жылля, бальніц, санаторыяў і дамоў адпачынку, дамоў для састарэлых і інвалідаў.

Зразумела, крыніцай гэтых сродкаў з'яўляецца праца работнікаў таго або іншага калектыву. Таму побач з клопатам аб умовах працы, сацыяльна-бытавых патрэбах членаў прафсаюза мы будзем і надалей садзейнічаць павышэнню эфектыўнасці вытворчасці, развіваючы сацыялістычнае спаборніцтва і працоўную актыўнасць сялян, удасканальваючы формы арганізацыі працы і яе стымулявання.

Іван ШКУРАТАЎ,
старшыня ЦК прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі.

ЭЛЕКТРОННЫ КАНТРАЛЁР СЭРЦА

У Маскве на ВДНГ СССР у павільёне «Хімія» Акадэміі навук СССР адкрылася выстаўка «Вучоныя акадэміі навук — медыцыне». Яе мэта — азнаямленне спецыялістаў з дасягненнямі вучоных у развіцці фундаментальных і прыкладных даследаванняў, накіраваных на вырашэнне актуальных праблем медыцыны.

Увагу наведвальнікаў прыцягвае электронны аўтаматычны кантралёр сэрца «Элакс», распрацаваны ў Інстытуце электронікі АН БССР. Ён прызначан для забеспячэння няспыннага кантролю за работай сэрца і сігналізацыі аб змяненнях частаты і рытму сардэчнай дзейнасці. У аснову работы прыбора пакладзен метад аналізу інтэрвалаў электракардыяграмы. «Элакс» валодае магчымасцю кантролю рытму адначасова ў трох пацыентаў, а таксама выяўлення розных відаў арытміі. Прымяненне прыбора дае магчымасць павысіць аператыўнасць і якасць назіранняў за работай сэрца. Забяспечваецца магчымасць візуальнага нагляду за частатой пульсу.

ЖЫВЕ НА ПАЛЕССІ ДОБРЫ ЧАЛАВЕК

ДОКТАР СІВУХА ВЫЛЕЧЫЦЬ

У ЧАС сваіх вандровак па Тураўскім Палессі я не раз чуў, як людзі гаварылі адзін аднаму: «Схадзі да Сівухі— ён вылечыць», «Парайся з Сівухам», «З'ездзі ў Хваенск, там жа жыве Сівуха»... З размоў я даведаўся, што Сівуха працуе доктарам у Хваенску, што ён чалавек высокай культуры і наогул варта было б з ім самім пагутарыць.

Я некалькі гадоў кружыў у наваколлях Хваенска — Перароў, Азяраны, Старажоўцы, Рычоў, а да Сівухі так і не дабраўся. Летась я праводзіў свой адпачынак з сябрамі на Прыпяці, у трох кіламетрах ад Хваенска.

Аднойчы ў час купання я разрэзаў аб ракавінку нагу. Прыкра, але суцяшала адно: пад бокам свой доктар, загадчык хірургічным аддзяленнем Гомельскай абласной бальніцы Анатоль Ярашэўскі, з якім мы разам адпачывалі. Анатоль зрабіў усё па навуцы, але прысуд пасля «аперацыі»быў жорсткі:

— Не купацца, і ўкол супраць слупняку. А з гэтым трэба ехаць да Сівухі.

— Адкуль ты яго ведаеш? — спытаў я ў сябра.

— Дык я ж з ім шэсць гадоў у медінстытуце ў Мінску вучыўся.

Дваццаць мінут язды — і мы ўрываемся ў шырокі затон, дзе вяжуць плыты і грузяць на баржы драўніну. На беразе затона і прымасціўся Хваенск. Гэта ўласна Хваенск, а менш двух кіламетраў ад яго — Майдан. Майдан — рабочы пасёлак лесанарыхтоўшчыкаў, атулены з трох бакоў густым лесам і вузкакалейкай. Па ёй і дабіраемся пешшу ў Хваенск—Майдан. У паветры вісіць жнівеньская палеская задуменнасць. Стрыножаная стогадовымі дубровамі цішыня напаўняе пасёлак.

Галоўнага ўрача Хваенскай участковай бальніцы Аляксея Сівуху сустрэлі на бальнічным двары, шырокім, з мноствам кветак, дэкаратыўных кустоў, дрэў. Бальніца літаральна патанае ў зеляніне. Агляд яе працягваўся з паўгадзіны. У палатах стэрыльная чысціня, дагледжанасць. Па дарозе з бальніцы ў амбулаторны корпус Аляксей Мікалаевіч паспеў расказаць:

— Наша бальніца спецыфічная. Усяго сем вёсак павінна абслугоўваць, а лечацца людзі і з Гомельскай, і з Брэсцкай, і нават з Жытомірскай абласцей. Справа ў тым, што лесасекі ад Хваенска далёка ўглыбіліся ў розныя раёны, і персанал нашай бальніцы забыў, што мы належым Жыткавіцкаму раёну. У хворага ж не папытаеш, адкуль ён. Хутчэй аказваеш медыцынскую дапамогу.

А я ведаю і іншае аб спецыфічнасці Хваенскай бальніцы. Прыпяць спакойная толькі летам, у спёку, калі ўзровень вады рэзка падае. А паглядзелі б вы на ўчастак Хваенскай бальніцы вясной 1979 года. Усе вёскі плавалі, у тым ліку і Хваенск з бальніцай, якая знаходзіцца на самым высокім месцы. Сівуха мне паказаў лінію, якую ён зрабіў маслянай фарбай на плоце бальніцы ў тую памятную паводку.

— Было ў нас дзве лодкі і некалькі пар гумавых ботаў. Ніхто не чакаў такога рэзкага пад'ёму вады. Пасля падкінулі нам рыштунку з Жыткавіч і Гомеля. Роды прыходзілася прымаць нават у маторцы. Хаця цяжарных жанчын мы загадзя вывозім у Тураўскую і Жыткавіцкую бальніцы, але бываюць выпадкі, калі ўсяго не прадугледзіш. Дапамагае нам санітарная авіяцыя, верталёты.

Расказвае гэта Аляксей Мікалаевіч, а я ўяўляю, як нялёгка дабірацца пад праліўным дажджом, сярод плаваючых аграмадзін-дрэў на ўскраіну ўчастка за дваццаць пяць кіламетраў. Можаш сам пяць разоў аказацца ў ледзяной вадзе, але хворы чакае цябе, доктара, і ты павінен даехаць. Аляксей Мікалаевіч крыху разышоўся і адкрыў маленькую тайну:

— Пішу невялікую работу. Называю яе: «Аказанне медыцынскай дапамогі ва ўмовах ракі Прыпяці». Пішацца цяжка, не хапае часу. У басейне Прыпяці дзесяткі такіх бальнічак, як наша. Магчыма, мая праца камусьці дапаможа. А было б яшчэ лепш, каб хтосьці такое пісаць стаў і пад Столінам, і пад Давыд-Гарадком ці Пінскам. Абмен думкамі, так сказаць. Іх вопыт і наш — і вось цэлае даследаванне...

У бальнічнай альтанцы Аляксей Мікалаевіч расказвае пра свой жыццёвы шлях:

— Родам я з Рэчыцкага раёна, з Ровенскай Слабады. Мне не было і дванаццаці гадоў, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Гора пабачыў — на ўсё жыццё хопіць. Пасля вайны скончыў школу, Гомельскае медвучылішча. Пайшоў служыць у Савецкую Армію. Даслужыўся да старшага лейтэнанта, а тут звальненне. Прыехаў у Ровенскую Слабаду, трэба будаваць дом. Маці памерла ў пяцьдзесят пятым годзе. У вёсцы бацька, два малодшыя браты і сястра. Усе свае афіцэрскія збяражэнні ўклаў у будаўніцтва дома, а сам падаўся ў медінстытут.

— І вось 18 гадоў у Хваенску,— падсумоўвае сказанае доктар. — Бальніца на трыццаць пяць ложкаў, нас два ўрачы, і пазалетась прыслалі дзяўчыну-стаматолага з вышэйшай адукацыяй.

Аляксей Мікалаевіч запрашае ў дом. Ісці недалёка, бо дом галоўнага ўрача стаіць на бальнічным двары. Калі ў бальніцы што здарыцца, то дзяжурная медсястра нават не звоніць: хутчэй можна дабегчы. Пах малін, апалых яблыкаў казыча ў носе.

— Я прынясу вам з калонкі свежай вады. Ведаеце, такой вады няма ва ўсёй ваколіцы, вельмі многа мінеральных солей, — прапануе гаспадар.

П'ём хваенскі «баржом». Пасля заходзім у хату. Я адразу звяртаю ўвагу на кнігі. На іх старонках нямала паметак, іншы раз на лацінскай мове. А кнігі дзевяцікласніка Юрыя стаяць на асобнай паліцы. Старэйшая дачка Сівухі, Валянціна, студэнтка Мінскага радыётэхнічнага інстытута. Жонка, Любоў Фёдараўна, працуе эканамістам у канторы ўчастка вытворчага аб'яднання «Мазырдрэў». Я пытаю, ці збіраецца Юра прадоўжыць род лекараў, але бацька нічога пэўнага не можа сказаць.

— Крыху не разумею сённяшнюю моладзь. Вось і Валя збіралася зусім іншую прафесію набываць, а ў апошні час, перад самымі ўступнымі экзаменамі, захацела на вылічальныя машыны пайсці. Магчыма, Юра зробіць такі ж нечаканы паварот у бок медыцыны... У нашым родзе ўрачоў няма: сястра Ніна—калгасніца, брат Мікалай—нафтавік у Сібіры, а Анатоль у Рэчыцкім заавэтэрынарным тэхнікуме працуе намеснікам дырэктара па выхаваўчай частцы. Усе здаровыя, бацьку восемдзесят шэсць гадоў, а яшчэ сена косіць.

Любоў Фёдараўна, сустрэўшы гасцей, прыносіць кошык ранетаў. Частуе.

А потым з Аляксеем Мікалаевічам ходзім па пасёлку. Людзі цёпла вітаюцца з ім, іншы раз ён просіць у нас прабачэння і падоўгу гаворыць з сустрэчнымі. Відаць, яго лекарская прафесія і тут не скідаецца з плеч.

...Рабочы дзень схіляўся к канцу. Мы развіталіся з Аляксеем Мікалаевічам. Ён доўга трос мне руку і гаварыў:

— Прыязджайце. Вам абавязкова трэба пабываць на Сіверскім возеры. Знаеце, на Каўказе гавораць: хто на Рыцы не быў, той Каўказа не бачыў. Я скажу так: хто на Сіверскім не быў, той Палесся не бачыў...

Я ішоў па зацягнутаму вечаровай смугой Хваенску і думаў, што абавязкова прыеду ў гэты край яшчэ, каб пабачыць і Прыпяць, і возера Сіверскае, а больш таму, што жыве ў Хваенску доктар Сівуха, чалавек, які кроўна звязаны з палескай зямлёй.

Уладзімір ВЕРАМЕЙЧЫК.

пішуць землякі

АБ НАШЫМ ЖЫЦЦІ

Мне здаецца, усім чытачам газеты — нашым суайчыннікам, хто жыве ў розных краінах, будзе цікава даведацца тое-сёе аб жыцці славянскіх эмігрантаў у Аўстраліі.

У свеце шмат гаворыцца аб загадкавай славянскай душы. Прыпісваецца многа рысаў, часам і такія, якія нам не ўласцівы. Але ўсе ведаюць, што славяне — людзі з адкрытым сэрцам, вельмі дружалюбныя.

Наша жыццё ў Аўстраліі ніколі не было лёгкім. Амаль усе зведалі на сабе дыскрымінацыю з-за свайго паходжання і мовы. Нават тыя, хто на працягу паўстагоддзя ўкладаў сваю працу ў развіццё гэтай краіны. Многім даводзіцца сутыкацца з дыскрымінацыяй і сёння.

На жаль, трэба прызнаць, што і сярод нас, рэдка, але трапляюцца людзі, якія прадалі сумленне і жывуць па законах капіталістычных джунгляў. Яны не маюць ніякіх адносін да прагрэсіўнай славянскай садружнасці, а сваімі дзеяннямі наносяць ёй толькі шкоду. Напрыклад, у Аўстраліі створана этнічнае радыё, якое часта перадае праграмы на розных славянскіх мовах, у асноўным у антысацыялістычным і антысавецкім духу. Па-мойму, большасць людзей уладкаваліся на гэтай радыёстанцыі не дзякуючы сваім ведам і здольнасцям. Іх трымаюць там з-за палітычных поглядаў. Амаль тое ж адбываецца і на этнічным тэлебачанні, перадачы якога не адлюстроўваюць сапраўднага становішча ў краінах, адкуль мы выйшлі, і ў свеце ў цэлым.

Гэта не можа не хваляваць прагрэсіўна настроеных славянскіх эмігрантаў. Бо падобныя радыё- і тэлеперадачы могуць стварыць у нашых дзяцей і ўнукаў, што нарадзіліся ў Аўстраліі, ды і ў многіх аўстралійцаў няправільнае, скажонае і шкоднае ўяўленне аб нашай Радзіме. На шчасце, гэтая антысавецкая прапаганда настолькі прымітыўная, што мала ўплывае на погляды маладых людзей славянскага паходжання. Ды і самі мы не сядзім склаўшы рукі. Многія славяне розных нацыянальнасцей актыўна ўдзельнічаюць у рабоце Рускага грамадскага клуба, дзе арганізоўваюцца канцэрты самадзейнасці, паказваюцца сучасныя савецкія кінафільмы. Падобныя мерапрыемствы выклікаюць вялікую цікавасць не толькі ў членаў клуба, але і ў многіх аўстралійцаў, якія таксама прыходзяць сюды. Шырокай папулярнасцю ў нашых эмігрантаў карыстаецца выдаваемы клубам часопіс «Дружба», у ім можна знайсці праўдзівую інфармацыю аб жыцці Радзімы і аб падзеях у свеце.

Такія культурныя мерапрыемствы дапамагаюць людзям розных нацыянальнасцей лепш зразумець адзін аднаго і падружыцца. Гэта наш невялікі ўклад у справу развіцця разрадкі. На мой погляд, падобныя адносіны паміж людзьмі павінны складвацца і ў сусветным маштабе. Ведаючы і разумеючы адзін аднаго, людзі заўсёды змогуць мірна вырашыць любыя праблемы. А гэта іменна тое, да чаго імкнецца цяпер усё прагрэсіўнае чалавецтва.

Г. ТОМПСАН-ТРАБІЦКОЙ.

Аўстралія.

Зямля любіць працавітых, дбайных гаспадароў. Заўсёды адорыць за клопаты добрым ураджаем. Працаўнікі калгаса імя Ціміразева Капыльскага раёна штогод павялічваюць ураджайнасць палёў, прадукцыйнасць жывёлагадоўлі. Адпаведна ўзрастаюць магчымасці гаспадаркі ў задавальненні асабістых патрэб калгаснікаў. Дабрабыт земляробаў умацоўваецца сацыяльна-культурнай базай, якую калгас няспынна пашырае, — новыя жыллёвыя, бытавыя аб'екты ўпрыгожылі сёлы гаспадаркі.

НА ЗДЫМКУ: даяркі за чаем у пакоі адпачынку Дома жывёлавода на цэнтральнай ферме калгаса.

Фота М. ХАДАСЕВІЧА.

Зіма як зіма, і снегу шмат, і маразы ўбіраюць дрэвы белым інеем.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

ПОБАЧ ДОБРЫЯ, ШЧЫРЫЯ ЛЮДЗІ

ЗА МЯЖОЙ РЭСПУБЛІКІ

Зазначу, слова «мяжа» мае ўмоўны сэнс. Справа ў тым, што ў СССР толькі на геаграфічных картах можна бачыць знакі размежаванняў паміж рэспублікамі, краямі, абласцямі, раёнамі.

Але ж пры сустрэчах землякоў, скажам, тут, у Ноўгарадскай вобласці, чуеш: «Я ўжо доўга жыву за мяжой рэспублікі...»

А нас, беларусаў, на старажытнай рускай зямлі 25 тысяч. Гэта нямала, калі ўлічыць, што ўсяго насельніцтва на Ноўгарадчыне 726 тысяч чакавек. І мы знешне не асабліва прыкметныя сярод рускіх. А калі і выдзяляемся, то, бадай, толькі мяккім акцэнтам пры размове.

Беларусы за мяжой рэспублікі?.. Гэта такія ж паўнапраўныя грамадзяне Савецкага Саюза, як і рускія, украінцы, узбекі, эстонцы... У нашай краіне наогул не існуе нацыянальных размежаванняў. У гэтым я пераканаўся за сваё амаль дваццацігадовае жыццё за межамі роднай Беларусі. Аб гэтым сведчаць і сустрэчы з землякамі. Пра некаторых з іх хачу расказаць.

РАБОЧЫ АЛЯКСАНДР КАСЯК

З Аляксандрам Касяком я знаёмы даўно. Ён пачынаў на вытворчым аб'яднанні «Хваля» вучнем слесара пасля дэмабілізацыі з арміі. Ажаніўся з ноўгарадскай дзяўчынай і застаўся тут. Мы з ім блізкія землякі — Аляксандр Касяк таксама родам з Гродзенскай вобласці. Сёння гэты рабочы чалавек добра вядомы на «Хвалі». Ён слесар высокай кваліфікацыі. Аляксандр кіруе брыгадай слесараў. У калектыве стаў сваім сярод рабочых.

Калі Аляксандр з Верай пажаніліся, то спачатку жылі ў яе бацькоў, Віктара і Ганны Кабаравых. Зараз у Аляксандра і Веры Касякоў нарадзіўся другі хлопчык Дзіма. Старэйшы Віталік вучыцца ў трэцім класе. Сям'я Касякоў пераехала ў асобную новую трохпакаёвую кватэру, якую прадаставіў завод.

— Гадаваць дзяцей дапамагаюць бацькі жонкі, — гаворыць Аляксандр.— Мая цешча амаль выгадавала нам Вітальку, а цяпер і Дзіму гадуем разам. Па прафесіі яна акушэр. Ганна Іванаўна вельмі любіць дзяцей і шчыра імкнецца дапамагчы нам.

Цесць Аляксандра Віктар Сяргеевіч, якому давялося прайсці з баямі ўсю вайну, таксама па-бацькоўску любіць сям'ю зяця.

Ёсць у беларуса Касяка ўсё, што робіць яго жыццё радасным: работа, сям'я, вакол шчырыя, добрыя людзі. Там, за мяжой Беларусі, ён жыве, як дома.

ВЫКЛАДЧЫК І ВУЧОНЫ

Нарадзіўся Георгій у Слуцку, але хутка яго бацькоў-настаўнікаў перавялі ў Астрахань. Тут Георгій Бржазоўскі закончыў дзесяцігодку, потым у 1940 годзе пайшоў служыць у Савецкую Армію. Быў пагранічнікам на Далёкім Усходзе.

Цяжкі тады быў час на граніцы.

На фронт Вялікай Айчыннай Георгій трапіў у 1942 годзе. Курская дуга, вызваленне Украіны, баі за Будапешт, Вену... Да снежня 1946 года вёў барацьбу з бандамі бандэраўцаў у лясах Заходняй Украіны. Потым паступіў у Астраханскі педагагічны інстытут. Закончыў і паехаў у Арэнбургскую вобласць. Адпрацаваў чатыры гады, паступіў у аспірантуру пры Ленінградскім педагагічным інстытуце.

— Пасля аспірантуры я і трапіў у Ноўгарад,— сказаў Георгій Іванавіч.— Амаль дваццаць пяць гадоў выкладаю ў мясцовым педінстытуце вышэйшую матэматыку.

У мінулым годзе ён пабываў на радзіме і таму падзяліўся сваімі ўражаннямі.

— Дзесяць год не быў у Слуцку. Там шмат перамен. Горад вельмі вырас.

У жыцці вучонага таксама адбыліся значныя перамены. Абараніў дысертацыю, стаў кандыдатам педагагічных навук. Надрукаваў шмат кніг. Апошняя — «Рашэнне трыгаметрычных ураўненняў, сістэм і няроўнасцей» толькі што выйшла з друку.

Георгій Бржазоўскі ўзнагароджаны знакамі «Выдатнік народнай асветы РСФСР» і «Выдатнік асветы СССР». Яго выбралі дэпутатам Ноўгарадскага абласнога Савета народных дэпутатаў.

Як член пастаяннай камісіі па народнай асвеце, Г. Бржазоўскі клапоціцца аб матэрыяльным забеспячэнні школ вобласці.

Вось так жыве яшчэ адзін беларус за мяжой рэспублікі. Гэтая «мяжа» не перашкодзіла яму атрымаць адукацыю, стаць вучоным, аўтарытэтным, паважаным чалавекам у брацкай рэспубліцы.

НЯВЕСТЫ ЕДУЦЬ... У РАСІЮ

Валянціна Мікуліч працавала ў Мяжанскай сельскай бібліятэцы ў Віцебскай вобласці, а трапіла ў саўгас «Мароўскі» на Ноўгарадчыну, бо выйшла замуж за дэмабілізаванага воіна Аляксея Міхайлава. Новая вёска, куды прыехалі з мужам, даволі вялікая, вясёлая. Валя спачатку працавала тут у паляводстве, потым стала загадчыцай мясцовай бібліятэкі.

Сям'я Міхайлавых дружная. Аляксей працуе механізатарам. Ён узначальвае механізаванае звяно па вырошчванню збожжа і лёну. Нават у леташні неспрыяльны па надвор'ю год атрымалі добры ўраджай.

— Калі я сюды прыехала, — гаворыць Валянціна, — мы жылі ў бацькоў мужа, а зараз маем свой дом. Дапамог саўгас. Купілі аўтамашыну «Жыгулі».

— А ўжо як пабудавалі новую хату, то трэба было купляць і сучасную мэблю, — уключаецца ў размову гаспадар. — Што датычыць паўсядзённых расходаў на харчаванне, адзежу і іншыя тавары, то грошай на гэта ідзе мала. Бульба, гародніна, фрукты — свае. Трымаем карову, цяля, двух-трох падсвінкаў кожны год, некалькі авечак, курэй, так што малака, мяса, масла, яек купляць не трэба.

Заможна жывуць Міхайлавы. На ўласным аўтамабілі ездзяць да дачкі Таццяны, якая выйшла замуж, жыве ў Ленінградзе і вучыцца там у інстытуце культуры.

— А на каго пакідаеце гаспадарку? — пытаюся.

— Свякроў дапамагае, — адказвае на маё пытанне Валянціна. — Дарэчы, яна і мне як маці. Вельмі добрая жанчына. Выняньчыла і Таню, і малодшага Юру, які зараз служыць у арміі. Каб не яна, то мне цяжка б давялося: я ж завочна закончыла Ленінградскі бібліятэчны тэхнікум.

* * *

Я коратка расказаў толькі аб траіх беларусах, якія жывуць разам са мной за мяжой БССР. Але іх жыццё характэрна і для ўсіх землякоў, звязаўшых свой лёс з Расіяй, у прыватнасці, з Ноўгарадчынай. Для такіх, скажам, як механік камбіната будаўнічых матэрыялаў Аляксей Болцікаў — ураджэнец Аршанскага раёна Віцебскай вобласці, кранаўшчык трэста «Электронбуд» Сяргей Фірага — таксама з Оршы, работнік шклянога цэха аб'яднання «Элкон» Іван Маскаль з Гомельшчыны, меліяратар Салецкай механізаванай калоны Сямён Вашкевіч — ураджэнец Глускага раёна Магілёўскай вобласці і многіх, многіх іншых.

У адрозненне ад замежных суайчыннікаў нас з радзімай раздзяляе толькі мяжа на геаграфічнай карце.

Сямён ЖАМОЙДА.

г. Ноўгарад.

...НЕ СТОЛЬКО НЕДОСТАТОК ВОЕННОЙ МОЩИ,

СКОЛЬКО ДЕФИЦИТ РАЗУМА

КТО СТРАШИТСЯ МИРА

О ХОРОШЕМ враче говорят — он лечит не болезнь, а больного. Ответственного государственного деятеля отличает умение видеть за деревьями лес, не смешивать причины и следствия, доискиваться истины, а не довольствоваться внешним симптомом, первым удобоваримым объяснением.

Мы живем в сложном мире. Более 150 государств населяют его. Каждое со своими интересами, традициями, проблемами. Не всем народам досталась на планете одинаково солнечная сторона. У всех разная за спиной история. И все стремятся к благосостоянию, хотя очень разнятся взгляды на него, так же, как и на пути, ведущие к прогрессу.

Будет ли дальше проще? Нет, не будет. Земля кормит сегодня 4,3 миллиарда людей. К концу века ей предстоит давать пищу, воду, тепло более чем 6 миллиардам. И это в условиях, когда самые доступные источники энергии и сырья истощаются, уменьшаются площади лесов, все интенсивнее расходуются ресурсы пресной воды, а освоение новых земель для нужд сельского хозяйства требует, как никогда, огромных вложений средств и труда.

Не может быть проще уже и потому, что разрыв в жизненном уровне между большинством стран «третьего мира» и государствами, которые относят к категории развитых, не сокращается и в ряде случаев возрастает. Но ни один народ и ни один человек не хочет чувствовать себя лишним и, естественно, вправе бороться за то, чтобы не быть лишним.

Многие трудности и угрозы, с которыми сталкивается ныне человечество, не новы. Они кочевали из века в век, обрастая коростой предубеждений, нетерпимости, враждебности. По большей части они были порождены политикой, ставившей во главу угла силу, политикой, покоившейся на ограблении и эксплуатации горсткой людей сотен и сотен миллионов людей на всех континентах.

Если быть честным, то придется признать и другое. О колониализме, фашизме и других крайностях империалистической политики мы не говорили бы в основном в прошедшем времени, не возникни мировая социалистическая система, не будь общего подъема национальных и социальных общественных движений, вызванного Великим Октябрем. Без происшедших в последние шесть с половиной десятилетий перемен на социальной карте мира нельзя было бы даже и помышлять о таких задачах, как перестройка на демократических началах международных политических и экономических отношений, как искоренение агрессии и войн, как соединение усилий международного сообщества государств ради решения проблем, волнующих человечество.

Однако в политике, как и в математике, некоторые задачи решаются годами и десятилетиями. Причем если в естественных науках темп и качество познания зависят в основном от объема накопленных данных и интеллектуального потенциала исследователей, то в политике зачастую определяющее значение имеют не объективная реальность, а узко понимаемые целесообразность и выгода.

ЧЕЛОВЕЧЕСТВУ пришлось пройти две мировые катастрофы, прежде чем государства провозгласили в Уставе ООН своей целью недопущение войны, высказались в пользу мирного международного сотрудничества. Не лишне вспомнить, что на протяжении более чем четверти века до этого выступления против войны и милитаризма, за разоружение и коллективную безопасность клеймились буржуазным Западом не иначе, как «коммунистическая пропаганда». Нельзя не вспомнить хотя бы потому, что и сейчас, в момент серьезного обострения напряженности, выступления против военной опасности и гонки вооружений снова пытаются изображать как «происки» Москвы, которая-де играет на тревоге людей за свое будущее, настраивает их против политики США и блока НАТО в целом.

Было бы, очевидно, неверно и вредно считать, что в капиталистическом мире не имелось раньше и не имеется теперь проницательных, здравых умом политиков, что на Западе никому не приходила и не приходит в голову мысль насчет важности заземления практической политики, приведения ее в соответствие с объективными условиями. Но все дело в том, что вырваться из привычного круга понятий или разорвать этот круг, даже когда он становится явно порочным, очень не просто. Общественный магнетизм, круговая порука интересов господствующих классов, психологическая инерция чрезвычайно сильны. Подчас настолько, что лишают общество способности найти свое место в непрерывно меняющемся мире. И обрекая себя, такое потерявшее перспективу общество тянет в бездну тяжких испытаний других, особенно когда речь идет об обществе с большим экономическим и военным потенциалом.

Почему нельзя об этом молчать? Да потому, что от признания на словах недопустимости войны до перестройки на деле политики государств дистанция громадного размера. Часто ли мы задумываемся над тем, что после 1945 года в вооруженных конфликтах погибло едва ли не столько же людей, сколько в разгар второй мировой войны?

Нельзя об этом молчать и потому, что страны, ответственные за обострение положения на Ближнем и Среднем Востоке, в Азии или Африке, в Латинской Америке или Европе, нагнетающие здесь напряженность и поныне, ищут способы переложить ответственность на других. Они убеждают общественность в том, будто кто-то другой повинен в гонке вооружений, в экономических неурядицах, в усилении общей нестабильности международных отношений. Они изобретают все новые вариации мифа о «советской угрозе», который сервируют к любому блюду. Им нужно отвести от себя недовольство масс. Им — в который раз—нужно пугало, перед лицом которого должны отступить на задний план внутренние проблемы.

В политике, какими бы заслонами ни ограждали от стороннего взгляда ее истоки, всегда присутствует чей-то интерес, она кому-то выгодна. Элемент случайности в политике меньше, чем обычно принято считать. Вместе с тем бо́льшую роль, чем во многих других областях человеческой деятельности, играет личность, наделенная властью. Поскольку из одних и тех же посылок могут делаться противоположные выводы, смена личностей подчас ведет к крутым сменам курсов. Это создает дополнительные трудности при решении сложных проблем, особенно при их поэтапном решении, которое само по себе предполагает в качестве непреложного условия успеха последовательность и непрерывность процесса.

НАУКА и промышленность постоянно обновляют запас идей, конструкций, технологии. Революционные открытия в этой области давно обогнали самые смелые фантазии. А в политике? Здесь каждый шаг вперед взвешивается на весах не столько будущего, сколько опыта прошлого, зачастую возникшего в совершенно другой, несравнимой с нынешней обстановке. Современная наука и техника зовет политику к взвешенности, предостерегает против авантюризма, бряцания оружием, обожествления насилия. Политика еще активнее и настойчивее, чем прежде, стремится поставить новейшие научные и технические достижения на службу концепциям, которые обветшали еще в доатомную пору.

Самое позднее с появлением ядерного оружия, которое остро поставило в повестку дня вопрос — быть или не быть человечеству, международное сообщество должно было бы сконцентрировать свои помыслы на прекращении гонки вооружений и решении споров между государствами исключительно мирными средствами. Случилось же нечто противоположное. Производство всех видов оружия приняло невиданный размах. Одного ядерного оружия накоплено в количестве, достаточном, чтобы многократно уничтожить на земле всякую жизнь. За первую «декаду разоружения», провозглашенную ООН, совокупные военные расходы государств росли быстрее, чем валовой национальный продукт. Все глубже в гонку вооружений втягиваются страны «третьего мира», где среднегодовые темпы увеличения военных ассигнований колеблются в настоящее время от 5 процентов в Латинской Америке, 7,5 процента в Африке до 15,5 процента в странах ОПЕК.

До недавнего времени никто (за исключением маоистских руководителей Китая) не оспаривал заложенных в таком развитии опасностей. Мало кто отрицал полезность разрядки в качестве перспективного направления сотрудничества. Народы с одобрением наблюдали в 70-х годах, как постепенно формировалась договорно-правовая и материальная ткань разрядки, как переводились на язык конкретных обязательств принципы равенства и одинаковой безопасности, обоюдной выгоды и взаимного уважения интересов. Большинство правительств и общественность всех континентов приветствовали, что СССР и США решили согласовывать свои усилия для предотвращения ядерной войны.

ДЛЯ СОВЕТСКОЙ стороны активное участие во всех начинаниях, которые подводили под здание мира более прочный фундамент, чем «равновесие страха», было логичным продолжением ее линии на преодоление опасности войны. Для США это был крупный, даже крутой поворот. Безусловно, поворот обоснованный, вытекавший из перемен в мире, в котором просто нельзя было дальше жить по-старому.

Такой поворот дался Соединенным Штатам не с первого захода. Надо было расстаться с воспоминаниями о временах, когда, как казалось многим американцам, США все могли. Нужно было отбросить иллюзии, что Соединенные Штаты в состоянии угрожать другим, диктовать им свою волю, оставаясь в относительной безопасности. Предстояло научиться выговаривать такие еретические, на вкус ультраконсервативных американских ретроградов, слова, как мирное сосуществование и мирное сотрудничество. С кем? Именно с коммунистами, с Советским Союзом, который в течение десятилетий подавался империалистической пропагандой как воплощение всех пороков. Предстояло что-то поправить в привычном высокомерном взгляде на чужое, на неамериканское. Нужно было допустить, что и чужак может быть прав, что его придется слушать и с ним считаться.

Но ставки были действительно стоящими: некоторые неудобства общежития окупались более надежной безопасностью; в перспективе отпадала необходимость иметь двойную, тройную перестраховку и открывалась, следовательно, возможность направить десятки и сотни миллиардов долларов в производительную сферу, на нужды культуры, образования, здравоохранения. Альтернатива разрядке представлялась тоже достаточно ясной: эскалация уровней военного противостояния, непредсказуемый риск региональной и глобальной конфронтации безо всякой обоснованной надежды на благополучный исход.

В общем, и с позиций правящего класса США не должен был смущать выбор в пользу политики разрядки, сотрудничества с Советским Союзом в тех областях, в которых ни одна система, ни одна идеология не могут претендовать на исключительность и монополию, без ущерба для собственных коренных интересов. Мир, если он узурпируется какой-то одной стороной, — уже не мир для другой, это не мир вообще. Мир может быть и должен быть только совместным благом и как таковое являться результатом совместных усилий и быть предметом совместных забот.

Примерно то же самое можно сказать об антиподе мира — о противоборстве и войне. Они — общее зло, если пренебречь ничтожными в сравнении с тяготами и лишениями, выпадающими на долю народов, корыстными интересами узкой прослойки людей, кормящихся от щедрот военно-промышленных комплексов. Это зло растет буквально в геометрической прогрессии. Сошлюсь хотя бы на данные военных потерь.

В XVII веке в вооруженных конфликтах в Европе погибло 3,3 миллиона человек, в XVIII веке — 5,3 миллиона, в XIX веке — 5,5 миллиона. Первая мировая война унесла 9,5 миллиона жизней, а вторая — 50 миллионов. Согласно оценкам серьезных специалистов, новый всемирный конфликт, случись он сегодня или завтра, уничтожил бы в считанные часы и дни целые народы и страны, сотни миллионов людей. Обрек бы на умирание миллиарды других и мог бы стать закатом человечества.

Спрашивается, во имя чего? Ведь ни одна сколько-нибудь существенная проблема не поддается больше решению силой. Возьмем такую насущную проблему, как удовлетворение энергетических потребностей. Ракеты и бомбы не поднимут из недр ни одной тонны нефти, не добудут ни кубометра природного газа. Они в состоянии разрушить то, что создано мирным трудом, но ничего не могут к нему добавить. Даже в мирное время военная машина поглощает энергию, и в огромных количествах, лишь усугубляя напряженность в этой области. Силовые варианты сулят видимость решений, ибо во всех отношениях они давно стали контрпродуктивными. В наш век невзгоды вызывает не столько недостаток военной мощи, сколько дефицит разума.

Попробуйте представить себе, что естествознание вдруг стало бы оперировать понятиями, бытовавшими в средние века, что все открытия XX века были бы преданы анафеме, к ним запретили бы обращаться под угрозой инквизиции. Невероятно, не правда ли? Даже самый отъявленный приверженец лозунга — назад, к природе, в глухую пещеру, не рискует чернить огульно научный прогресс.

А в политике подобное оказывается возможным. То, что было единственно верным вчера, объявляется вздором. И наоборот, то, что исходя из фактов, из трезвого анализа, было отвергнуто как неоправдавшее себя в прошлом и чрезвычайно опасное для будущего, опять возносится на пьедестал. Может быть, изменились реальности, те не зависящие от вкусов и наклонностей политиков объективные обстоятельства, которые подвели правительства на рубеже 60—70-х годов к выводу — или разрядка или ядерная катастрофа?

Нет, международная обстановка ухудшилась и ухудшается не сама собой, как не сама собой она улучшилась несколькими годами ранее. Ее сделали хуже конкретные люди, конкретные правительства, которые руководствовались вполне определенными расчетами. Если сначала до этих расчетов еще надо было доискиваться, если где-то в середине 70-х годов подкоп под разрядку велся с соблюдением маскировки, то затем забрало было открыто, низвержение политики сотрудничества, мирного сосуществования было провозглашено в качестве официального государственного курса. О Советском Союзе стали опять говорить не как о партнере, но только как о противнике и враге.

Что же больше всего не устраивало в разрядке круги, которые задают сейчас тон в политике США и ряда других западных стран? Послушаем небезызвестного сенатора Джексона, сделавшего карьеру на яром антисоветизме. Свою оппозицию договору об ОСВ-2 Джексон обосновывал нежеланием дополнительно усовершенствовать его положения с учетом особых американских интересов. Сенатор находил договор неприемлемым прежде всего по мотивам его возможных политических и психологических последствий. Джексона не устраивало, что процесс ограничения вооружений и ОСВ-2 как его составная часть могут создать чувство «ложной безопасности», «расслабить американцев».

Иными словами, Соединенным Штатам, позвольте повторить, нужен враг, нужна цель, на которую было бы наведено их оружие с тем, чтобы оправдать накопление последнего. Это необходимо, чтобы держать в узде свое население, чтобы подтягивать дисциплину среди союзников, чтобы насаждать и поощрять репрессивные режимы, готовые служить Вашингтону, чтобы под разговоры о «защите общих интересов» капиталистической системы водружать американский флаг там, где монополии США чуют добычу или, напротив, опасность для своих барышей.

Сотрудничество, добрососедство и даже такое неполитическое понятие, как порядочность, не сочетаются с подходом, основанным на безбрежном произволе и отсутствии принципов. Кроме одного — мой интерес всегда выше интереса других, мой аргумент всегда весомее, когда на моей стороне сила (если ее недостает сейчас, то попытаюсь добиться превосходства завтра), потому что нет ни моральных, ни иных сомнений в использовании этой силы, в том числе ее, как выражаются в США, концентрированного выражения — ядерного оружия.

КОГДА Советский Союз говорит о мире как путеводной нити нашей внешней и внутренней политики, о недопустимости ядерной войны и готовности СССР взять на себя в этой связи самые далеко идущие обязательства, это документирует, наряду с миролюбием, убежденность в правоте нашего дела. Мы не боимся мирного соревнования с другими системами.

Когда западные политики страшатся мира, честного, равноправного сотрудничества, они демонстрируют не просто политическую ограниченность, но прежде всего ограниченность строя, не верящего в свое будущее. Здесь объяснение тому, что логика жизни, логика фактов оказывается все менее удобной для некоторых империалистических держав.

Валентин ФАЛИН.

ПАЛАЦ ДЛЯ ЎСІХ



Да позняга вечара ветліва свеціцца агнямі брэсцкі Палац культуры прафсаюзаў, які гасцінна расчыніў свае дзверы для наведвальнікаў летась, у першым годзе новай пяцігодкі. У ім можна добра адпачыць пасля рабочага дня, сустрэцца з сябрамі, заняцца любімай справай. Каля ста супрацоўнікаў Палаца дапамагаюць брастчанам цікава і з карысцю праводзіць свой вольны час. Тут працуе народны хор і ансамбль песні і танца «Бярэсце», дзіцячая харэаграфічная і тэатральная студыі, клуб аматараў фальклорнай музыкі, маладзёжная дыскатэка, арганізуюцца розныя выстаўкі.

НА ЗДЫМКАХ: Палац культуры прафсаюзаў у Брэсце; ва ўрачыстай абстаноўцы тут бяруць шлюб маладыя; рэпетыцыя танцавальнай групы ансамбля песні і танца «Бярэсце»; на выстаўцы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Фота Э. КАБЯКА.

«НЯЛЁГКАЯ» ЛЁГКАЯ МУЗЫКА РАЙМАНДА ПАЎЛСА

КОЖНАЯ ПЕСНЯ ЯК АДКРЫЦЦЁ

Кампазітар Райманд Паўлс стварыў музыку да 20 тэатральных спектакляў, да 20 кінастужак, творы сімфанічныя і камерныя, мюзіклы, аперэты і больш за 300 песень. Па колькасці запісаных грампласцінак ён, бадай, з'яўляецца лідэрам грамзапісу ў галіне джазавай і папулярнай музыкі апошняга дзесяцігоддзя.

Нарадзіўся Райманд у Латвіі, на ўскраіне Рыгі, у рабочай сям'і. Музычную кар'еру пачаў у 50-я гады — час усеагульнага захаплення джазам. Не абышло гэта захапленне і маладога Райманда. Слухаючы запісы Дзюка Элінгтона, Каунта Бесі, Глена Мілера, Оскара Пітэрсана, Джорджа Гершвіна, ён хутка падбіраў на слых на раялі мелодыі сваіх куміраў, спрабаваў імправізаваць. І хутка ў Рызе да Паўлса прыйшла слава віртуознага джазавага піяніста.

І ўсё ж спачатку і знаёмыя, і блізкія не прадказвалі здольнаму выпускніку Рыжскай кансерваторыі кар'еры кампазітара эстрадных песень. Тым не менш найбольш актыўна і плённа Райманд Паўлс працуе менавіта ў гэтай галіне. Працуе ўдумліва, спрабуючы асэнсаваць новыя павевы ў гэтым жанры. «У сучасную песню прыйшлі новыя думкі і пачуцці, настроі і вобразы,— гаворыць кампазітар.—Гэтае мастацтва, якое з'яўляецца найбольш масавым, сёння патрабуе пільнай увагі да сябе. Многія песні сталі больш глыбокімі і складанымі па музычнай мове. Нарэшце, у многім змяніліся тэхнічныя сродкі ўвасаблення і распаўсюджання песні — сёння яна ўсё часцей ствараецца для запісу з дапамогай складанейшай гукаапаратуры. Кожны раз тут трэба рабіць нейкае адкрыццё».

Але нягледзячы на тое, што Паўлс умела і з вялікім густам выкарыстоўвае ў сваіх творах гэтыя новыя тэхнічныя магчымасці, свабодная імправізацыя, інструментальная аснова песень, лірычная мелодыя — найбольш моцныя бакі яго творчасці.

Звычайна Райманд піша дома, накідваючы контуры якой-небудзь мелодыі, потым усё гэта адкладвае, нібыта стараючыся забыць. Гэта яшчэ не песня, а толькі яе ідэя. Праходзіць час, і кампазітар вяртаецца да сваіх накідаў, стараючыся ўспрыняць іх ужо як слухач. І калі Паўлсу-слухачу падабаецца мелодыя, толькі тады пачынаецца сур'ёзная работа...

Характэрна, што для многіх ужо вядомых выканаўцаў творчая біяграфія пачалася іменна з песень Райманда Паўлса: не раз яго творы выводзілі артыстаў на прызавыя месцы ў міжнародных конкурсах. Не можа не радаваць і творчая стабільнасць кампазітара. Яго новыя песні вось ужо на працягу некалькіх гадоў становяцца як бы візітнымі карткамі музычнага года. І поспех гэты невыпадковы, за ім вялікая праца, вялікая любоў да сваёй справы. Кампазітар актыўна займаецца пошукам маладых выканаўцаў, клапоціцца аб іх творчым лёсе. Яго можна часта ўбачыць не толькі ў журы ўсесаюзных або рэспубліканскіх конкурсаў, але і ў сельскім або заводскім клубе, дзе праходзіць агляд самадзейных музыкантаў. Нора Бумбіерэ і Віктар Лапчонак, Ояр Грынберг і Маргарыта Вілцане, Мірдза Зіверэ і ансамбль «Мода» — сёння вядучыя прадстаўнікі латышскай эстрады, і гэта ў многім вынік творчай энергіі кампазітара.

Вельмі цікавым і перспектыўным аказаўся творчы альянс кампазітара са спявачкай Алай Пугачовай. Іх апошнія сумесныя работы — песні «Маэстра», «На біс» — сталі сапраўды адкрыццём для многіх прыхільнікаў эстраднага мастацтва.

Але добрая песня — гэта не толькі выдатная музыка і дакладны выбар выканаўцы. Райманд Паўлс вельмі патрабавальны да тэкстаў сваіх песень, і не выпадкова, што з кампазітарам супрацоўнічаюць такія цікавыя паэты, як Андрэй Вазнясенскі, Роберт Раждзественскі, Андрэй Дзяменцьеў, Яніс Петэрс.

Заслужаны дзеяч мастацтваў і народны артыст Латвіі, лаўрэат рэспубліканскай Дзяржаўнай прэміі, Райманд Паўлс з'яўляецца галоўным рэжысёрам музычных праграм Латвійскага радыё і тэлебачання, пастаянна выступае з творчымі канцэртамі, шмат часу ўдзяляе грамадскай рабоце...

«Маё жыццё — гэта мая работа,— гаворыць Райманд Паўлс. —Гэта для мяне самае галоўнае. Таму, калі я выходжу на сцэну і бачу людзей, якія чакаюць маёй музыкі, мне больш нічога не трэба. Гэта самая вялікая плата за маю працу».

Генадзь ГАЛАЎКО.

ВЫДАНА СПЕЦЫЯЛЬНАЯ КАРОТКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ «БЕЛАРУСКАЯ ССР» У ЧАТЫРОХ ТАМАХ

УСЁ ПРА РОДНЫ КРАЙ

Чытач знойдзе ў энцыклапедыі багаты матэрыял пра ўсе бакі сучаснага жыцця беларускага народа, пра яго гістарычнае мінулае. На строгай дакументальнай аснове, на канкрэтных лічбах і фактах паказаны працэс усебаковага развіцця і росквіту Савецкай Беларусі: яе эканомікі і культуры, навукі і тэхнікі, адукацыі і медыцынскага абслугоўвання, фізкультуры і спорту. У энцыклапедыі змяшчаюцца звесткі аб прыродзе рэспублікі, яе геалагічнай будове, карысных выкапнях, лясах, азёрах, рэках, балотах, клімаце, раслінным і жывёльным свеце.

Асобныя раздзелы прысвечаны праблемам народанасельніцтва, развіццю этнаграфіі і фальклору, літаратуры, мастацтва, архітэктуры. Шмат увагі ўдзелена расказу аб сучасным і раней існаваўшым адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні рэспублікі, яе населеных пунктах, заканадаўстве і праве, міжнародных сувязях, дзейнасці розных грамадскіх арганізацый. Публікуюцца матэрыялы аб развіцці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, транспарту, сувязі, найбольш буйных прамысловых прадпрыемствах, калгасах, саўгасах. Пераканаўча паказана, што вышэйшая мэта грамадскай вытворчасці пры сацыялізме — найбольш поўнае задавальненне растучых матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей працоўных, рост народнага дабрабыту. Шырока асвятляюцца ўсебаковае супрацоўніцтва Беларусі з брацкімі саюзнымі рэспублікамі, з народамі сацыялістычных краін. У цэлым у чатырох тамах энцыклапедыі апублікавана каля 12 тысяч артыкулаў. Выдадзена яна на дзвюх мовах — беларускай і рускай, што, несумненна, расшырае кола людзей, якія змогуць карыстацца гэтым унікальным даведнікам.

Значнай вартасцю выдання з'яўляецца гістарычны падыход да аналізу розных бакоў жыцця рэспублікі. У энцыклапедыі можна знайсці звесткі як аб сучасным стане эканомікі, навукі, літаратуры, мастацтва і г. д., так і аб іх развіцці ў мінулым. Напрыклад, на аднаго жыхара Расіі ў 1913 годзе на народную адукацыю выдзялялася 80 капеек у год. У 1914—1915 навучальным годзе ў Беларусі было 7 682 агульнаадукацыйныя школы ўсіх тыпаў, у тым ліку 7 492 пачатковыя, 119 няпоўных сярэдніх, 71 сярэдняя. Іх наведвала пятая частка ўсіх дзяцей школьнага ўзросту. Не выпадкова па перапісу 1897 года сярод насельніцтва ва ўзросце ад 9 да 49 гадоў пісьменныя склалі ўсяго 32 працэнты.

Толькі пасля перамогі Вялікага Кастрычніка была ліквідавана непісьменнасць. У 1932 годзе ў БССР ажыццёўлена ўсеагульнае пачатковае навучанне. У гады Вялікай Айчыннай вайны нямецка-фашысцкія акупанты разбурылі 8 825 школ, усе дашкольныя ўстановы, таму пасля вызвалення Беларусі былі прыняты неадкладныя меры па іх аднаўленню. Ужо ў 1951—1955 гадах уведзена ўсеагульная сямігадовая, а ў 1972 годзе — усеагульная сярэдняя адукацыя. Цяпер у рэспубліцы працуе больш за 106 тысяч настаўнікаў. Педагагічныя кадры для школ рыхтуюць тры універсітэты, 6 педагагічных інстытутаў, 10 педагагічных вучылішчаў. У нашай рэспубліцы, як і ў краіне ў цэлым, адукацыя з'яўляецца важнейшай усенароднай справай. Цяпер практычна ўсе маладыя людзі ўступаюць у самастойнае жыццё, маючы сярэднюю адукацыю, якая служыць надзейнай прыступкай далейшага прафесійнага, культурнага росту асобы.

У энцыклапедыі значнае месца адведзена барацьбе беларускага народа за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне. Тэрыторыю Беларусі не мінулі многія войны і нашэсці. Але самым разбуральным і жорсткім аказалася нашэсце нямецка-фашысцкіх варвараў. За гады вайны загінуў кожны чацвёрты жыхар рэспублікі, яе гарады ляжалі ў руінах, тысячы сёл, заводаў, калгасаў былі знішчаны і разрабаваны. Беларускі народ аказаў гераічнае супраціўленне ворагу. Так, у партызанскіх фарміраваннях змагалася больш за 374 тысячы чалавек, з іх 16 працэнтаў складалі жанчыны. 400 тысяч чалавек налічвалі так званыя скрытыя партызанскія рэзервы. Звыш 70 тысяч патрыётаў дзейнічалі ў падпольных арганізацыях і групах. Барацьба з гітлераўскімі захопнікамі насіла сапраўды ўсенародны, інтэрнацыянальны характар. У партызанскіх атрадах поплеч змагаліся беларусы, рускія, украінцы, літоўцы, латышы, грузіны, армяне, узбекі, азербайджанцы, малдаване, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей СССР, палякі, славакі, чэхі, балга-

На сцэне народны хор саўгаса імя Углоўскага Віцебскага раёна. Фота У. КРУКА.

НОВЫ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ АЛЬМАНАХ

ДАЛЯГЛЯДЫ БРАТЭРСТВА

Сёлета выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціць у свет першы нумар літаратурна-мастацкага зборніка «Братэрства». Наш няштатны карэспандэнт Ігар ГЕРМЯНЧУК на днях сустрэўся з галоўным рэдактарам альманаха паэтам Рыгорам БАРАДУЛІНЫМ і папрасіў яго адказаць на некалькі пытанняў.

— Рыгор, скажыце, калі ласка, чым выкліканы выхад гэтага зборніка?

— Найперш, узросшай цікавасцю беларусаў не толькі да твораў уласных пісьменнікаў, але і іншых літаратур СССР. А магчымасці друкавання перакладных твораў у нас, як вядома, не вялікія. У рэспубліцы няма часопісаў тыпу рускай «Иностранной литературы» ці ўкраінскага «Всесвіту». Выходзіць толькі штогадовы зборнік «Далягляды».

— «Братэрства» будзе нечым падобнае да альманаха «Далягляды»?

— Так. Але і адрозненні мае. «Далягляды» зараз будуць друкаваць толькі творы літаратур краін сацыялістычнай садружнасці і прагрэсіўных пісьменнікаў заходняга свету. Зборнік жа «Братэрства» ставіць сваёй мэтай знаёміць беларусаў з прыгожым пісьменствам народаў СССР. На яго старонках знойдуць месца творы розных жанраў: аповесці і раманы, апавяданні і эсэ, вершы і паэмы, літаратурнакрытычныя артыкулы і рэцэнзіі, водгукі на выданні беларускай літаратуры ў іншых рэспубліках, інтэрв'ю з вядомымі пісьменнікамі і перакладчыкамі, разнастайныя ілюстрацыі і іншае. Да супрацоўніцтва мы запрашаем не толькі сталых і вядомых перакладчыкаў, але і маладых літаратараў. Тым самым зборнік будзе спрыяць выхаванню новых майстроў мастацкага перакладу.

— Рыгор, што прапануе сваім чытачам першы нумар «Братэрства»?

— Выхад літаратурнага зборніка супадае з 60-годдзем стварэння СССР. Таму мы мяркуем прадставіць у альманаху літаратуры ўсіх савецкіх рэспублік. Янка Брыль, напрыклад, пазнаёміць з творчасцю празаікаў Украіны. Максім Танк прапануе вершы Мірзо Турсун-задэ і латышскіх паэтаў. Максім Лужанін пераклаў для зборніка некалькі вершаў Аляксандра Твардоўскага. Будзе таксама надрукавана апавяданне рускага празаіка Сяргея Залыгіна з прадмовай народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, аповесць азербайджанскага пісьменніка Ахмеда Сабірава «Джаміль» у перакладзе Уладзіміра Шахаўца. Алесь Разанаў прадставіць паэтаў братняй Літвы. Падборку вершаў казахскай паэтэсы Фарызы Унчарсынавай пераклала Яўгенія Янішчыц. З эстонскай літаратуры мы выбралі аповесць Юры Туулика «Заморская справа». Да 70-годдзя М. Танка эсэ піша Альбінас Жукаўскас, заслужаны дзеяч культуры БССР, старэйшы літоўскі паэт. Генадзь Бураўкін працуе над артыкулам пра сваіх сяброў — літаратараў з братніх рэспублік.

Адзначым у зборніку і 100-годдзе класікаў нашай літаратуры. Рыхтуюцца пераклады вершаў, прысвечаных Янку Купалу і Якубу Коласу, а таксама эсэ і выказванні пра іх творчасць.

— Якім вы бачыце далейшы лёс «Братэрства»?

— Зараз на гэтае пытанне адказаць цяжка. Пра лёс зборніка можна пакуль толькі меркаваць. Ад чаго ён будзе залежаць? У значнай ступені ад навізны і мастацкай вартасці перакладаў. Набыткі ў гэтай галіне ў нас з кожным годам павялічваюцца, але колькасны іх рост не заўсёды супадае з ростам якасным. Поспеху мастацкі пераклад дасягае толькі тады, калі ён ажыццяўляецца з арыгінала. Перакладчыкі ж часам вымушаны карыстацца тэкстам-пасрэднікам. Я маю на ўвазе не падрадкоўнік, а пераклад з перакладу. Гэта, безумоўна, нясе не толькі стыхію іншай мовы, але і іншага стылю. Таму мы будзем імкнуцца друкаваць выключна творы, перакладзеныя непасрэдна з мовы арыгінала або ў выключных выпадках — з падрадкоўніка. Без гэтага ніяк нельга. Інакш у чытача не будзе даверу да мастацкай паўнацэннасці надрукаваных твораў. Безумоўна, не варта забываць і тых рашэнняў, якія прапанавалі суседзі або пасрэднікі. Было б неразумна не скарыстоўваць іх творчыя прынцыпы, калі яны атрымалі выпрабаванне і праверку часам і могуць прыжыцца ў іншай моўнай стыхіі.

Не перашкодзяць справе і блізкія кантакты з пісьменнікамі, якіх перакладаеш. Гэта дае вельмі і вельмі станоўчыя вынікі. У свой час Гётэ гаварыў, што, каб зразумець пісьменніка, трэба пабываць на яго радзіме. І гэта натуральна. Без усебаковага ведання побыту народа, чыйго пісьменніка перакладаеш, нельга адчуць аспекты яго творчасці.

Будзем верыць у поспех.

ры, сербы, харваты, французы, венгры, немцы... У той жа час беларусы былі ў радах партызан брацкіх савецкіх рэспублік, удзельнічалі ў руху Супраціўлення народаў Францыі, Італіі, Грэцыі і іншых еўрапейскіх краін.

Беларускі народ свята шануе памяць аб сваёй гісторыі, гераічным мінулым, аб людзях, якія аддалі жыццё за яго свабоду і незалежнасць. На тэрыторыі рэспублікі налічваецца больш за 14,5 тысячы помнікаў гісторыі і культуры. З іх больш 6 200 прысвечаны рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славе савецкага народа. Мільёны людзей нашай краіны і з-за рубяжа наведваюць мемарыяльны комплекс «Хатынь», узведзены на месцы спаленай фашыстамі вёскі, Брэсцкую крэпасць-герой, Курган Славы пад Мінскам і іншыя свяшчэнныя для савецкага народа месцы. Да помнікаў, да магіл загінуўшых ідуць людзі ў Дзень Перамогі. Сюды прыносяць кветкі маладажоны ў дзень шлюбу, прыязджаюць ветэраны вайны, сваякі загінуўшых з іншых рэспублік. Імёнамі народных герояў названы вуліцы, школы, піянерскія дружыны, гэтыя імёны ўнесены ў спісы воінскіх часцей і працоўных калектываў. Паўсюдна ў Беларусі вядуцца летапісы народнай славы, каб ніводнае імя дарослага ці дзіцяці не было ўпушчана ці забыта. Памяць аб вайне гаворыць: такое не павінна паўтарыцца ніколі.

Важна таксама адзначыць, што энцыклапедыя, расказваючы аб розных баках сучаснага жыцця адной з савецкіх рэспублік, тым не менш не замыкаецца ў ёй. Тысячамі ніцей звязана Беларуская ССР з жыццём усяго савецкага народа. Беларусы ёсць сярод тых, хто будуе БАМ, асвойвае Сібір, яны жывуць і працуюць ва ўсіх саюзных рэспубліках. У той жа час у Беларусі жывуць прадстаўнікі больш ста нацый і народнасцей. Як у кроплі расы адлюстроўваецца сонца, так і ва ўпэўненым поступе беларускага народа, у яго сённяшніх дасягненнях і дабрабыце адлюстравана вялікая сіла дружбы, брацтва, узаемадапамогі ўсіх савецкіх народаў. У энцыклапедыі прыводзяцца шматлікія даныя аб той бескарыслівай дапамозе, якая была аказана рэспубліцы брацкімі народамі, і ў першую чаргу рускім народам, у развіцці яе эканомікі, навукі, тэхнікі, культуры, у пасляваенным аднаўленні народнай гаспадаркі. Цяпер Беларуская ССР з'яўляецца адным з найбольш развітых эканамічных раёнаў Савецкага Саюза.

З выданнем спецыяльнай кароткай энцыклапедыі «Беларуская ССР» чытачы атрымалі яшчэ адну добрую магчымасць параўноўваць сучаснае і мінулае рэспублікі, на канкрэтных прыкладах, лічбах і фактах пераконвацца ў тых гістарычных перавагах, якія нясе з сабой сацыялізм, брацкае супрацоўніцтва свабодных народаў. Глыбей пазнаючы гісторыю, культурную спадчыну, гераічнае мінулае, імклівы тэмп сённяшніх сацыяльных пераўтварэнняў, мы па праву ганарымся нашай рэспублікай, больш цэнім і любім цудоўны, пераўвасоблены працай, талентам многіх пакаленняў людзей куток Зямлі, які здаўна завецца Беларуссю.

Ніна ДЗЕНІСЮК.

ПЕРАКЛАДЫ—МАСТЫ ДРУЖБЫ

Вядомы балгарскі паэт, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, народны дзеяч культуры, намеснік старшыні Саюза балгарскіх пісьменнікаў Младзен Ісаеў быў у Мінску ўсяго два дні. Ён узначальваў дэлегацыю на Днях балгарскай літаратуры ў Савецкім Саюзе, прысвечаных 1300-годдзю Балгарскай дзяржавы. Праграма знаходжання дэлегацыі была вельмі насычанай: экскурсія па гораду-герою, наведанне Дома-музея I з'езда РСДРП, Літаратурнага музея Янкі Купалы, музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, паездка да мемарыяльнага комплексу «Хатынь», літаратурны вечар у Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя М. Горкага, гутарка ў Саюзе пісьменнікаў Беларусі.

Нягледзячы на свае семдзесят пяць год, Младзен Ісаеў удзельнічаў ва ўсіх паездках і сустрэчах. Наша кароткая гутарка адбылася ў аўтобусе па дарозе ў аэрапорт.

— Здаецца, вы ўпершыню ў Беларусі?

— Упершыню. Ведаў пра яе толькі з літаратуры. Праўда, я асабіста знаёмы з Танкам, Быкавым, Гілевічам, яны прыязджалі да нас. Вельмі рады, што сустрэўся зноў са сваімі сябрамі. Гэта людзі шчырыя, душэўныя.

— Што вас асабліва кранула за гэтыя два дні?

— Хатынь і музей Айчыннай вайны ўзрушылі да слёз. Я ніколі не бачыў падобнага. Вы панеслі самыя цяжкія страты. Першае дзеянне трагедыі разгулялася на вашай зямлі. Але вы аказаліся магутным народам, бо адбудавалі ўсё. Мы, пісьменнікі, якія закліканы апяваць прыгажосць, ніколі не павінны забываць пра пагрозу міру.

Уразіла і сустрэча ў педагагічным інстытуце, бо гэта была сустрэча з моладдзю Мінска. Публіка вельмі чулая, цікаўная, разумная. Прыемнай нечаканасцю для нас стала тое, што выступалі не толькі пісьменнікі, вершы у перакладзе на беларускую мову чыталіся і артыстамі.

Выступаючы перад студэнтамі, Младзен Ісаеў сказаў: «Дзякуй беларускім пісьменнікам, што прыйшлі сюды, дзякуй перакладчыкам балгарскай паэзіі. Асаблівую падзяку я хачу выказаць першаму сакратару Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэту і перакладчыку Нілу Гілевічу. Ён пабудаваў мост паміж душамі балгарскіх паэтаў і беларускімі чытачамі. І сёння наша паэзія прыйшла да вас».

У гутарцы з госцем я нагадаў, што ў Балгарыі нямала выходзіць кніжак беларускіх пісьменнікаў, што ў нас там шмат сяброў.

— Я вельмі рады, што ўстанавіліся такія блізкія кантакты. Галоўнае — трэба яшчэ больш перакладаць беларускай літаратуры ў Балгарыі і балгарскай — у вас, — сказаў пісьменнік.

— Ваша галоўнае ўражанне ад беларускай літаратуры?

— Я чытаў Купалу, Коласа, Куляшова, Танка, Гілевіча. Асноўнае ўражанне? Гэта блізкасць да народа, яркія нацыянальныя характары, — адказаў Младзен Ісаеў і дадаў: — Шкада, што мы так мала былі, усяго два дні. Спадзяюся на будучую сустрэчу.

Гутарку вёў Аляксей ГАРДЗІЦКІ.

прэм'еры, выстаўкі, сустрэчы

ПРЫСВЯЧАЕЦЦА ЯКУБУ КОЛАСУ

Напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа, якое па рашэнню ЮНЕСКА будзе адзначацца ва ўсім свеце, экспазіцыя музея ў вёсцы Мікалаеўшчына папоўнілася новымі экспанатамі. Сярод іх — кнігі Якуба Коласа, выдадзеныя на мовах народаў СССР, у замежных краінах, работы савецкіх пісьменнікаў, прысвечаныя песняру народнай долі.

Завершана выданне 14-томнага збору твораў паэта, выпушчаны альбом «Жыццё і творчасць Я. Коласа». Кінастудыя «Беларусьфільм» закончыла здымкі дакументальнай стужкі пра паэта. Выдавецтва «Художественная литература» выпускае на рускай мове чатырохтомнік твораў паэта, а выдавецтва «Правда» — яго выбраныя творы.

КАРЧАГІНЦЫ З'ЯЎЛЯЮЦЦА ПРЫКЛАДАМ

Замежныя студэнты, што вучацца ў Беларускім політэхнічным інстытуце, правялі дыскусію па раману Мікалая Астроўскага «Як гартавалася сталь» — першай кнізе, прачытанай імі на рускай мове. Студэнты з Лівана, Палесціны, Рэспублікі Чад, Афганістана, Мадагаскара на канкрэтных прыкладах паказалі, які ўплыў на моладзь іх краін аказвае гэты твор.

НАВІНА СТАРЫХ ПЕСЕНЬ

У Маскве прайшоў Усесаюзны фальклорны фестываль, у якім прыняў удзел беларускі этнаграфічны калектыў з вёскі Ананчыцы Салігорскага раёна. Прастата і натуральнасць, сціпласць і задушэўнасць, з якімі прагучалі яго песні, атрымалі на фестывалі высокую ацэнку спецыялістаў.

Ананчыцкі калектыў прадэманстраваў сваё майстэрства ў Дзяржаўным музычна-педагагічным інстытуце імя Гнесіных, у канцэртнай зале Саюза кампазітараў СССР, выступленні спевакоў з беларускай вёскі запісаны на Цэнтральным тэлебачанні, на Усесаюзнай студыі грамзапісу «Мелодия».

ТЭМЫ ПАДКАЗАЛА ПАЕЗДКА

Працоўныя Гомельшчыны і Паўднёва-Чэшскай вобласці (ЧССР) спаборнічаюць, дзеляцца перадавым вопытам. Цесныя сувязі і паміж творчымі калектывамі. У Паўднёвай Чэхіі пабывалі гомельскія жывапісцы Д. Алейнік і М. Казакевіч. На працягу двух тыдняў яны разам з калегамі з Чэхаславакіі і іншых краін сацыялістычнай садружнасці пісалі эцюды аб непайторнай прыгажосці Паўднёвай Чэхіі, жыцці братняга народа. Вынікам паездкі з'явіцца выстаўка работ, над якімі цяпер працуюць мастакі.

Спектакль «Млечны шлях» паводле твора К. Чорнага паказала гледачам Беларускае тэлебачанне. На экране ўзноўлены падзеі Вялікай Айчыннай вайны, дзейнічаюць прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, выразна гучыць матыў неадольнасці жыцця нават у бесчалавечных умовах фашысцкага нашэсця.

НА ЗДЫМКУ: сцэна з тэлеспектакля.

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

АКВАРЭЛІ ПАЎЛЫ КРАСАВІНАЙ



Нядаўна пазнаёміўся з вельмі цікавым чалавекам, самадзейнай мастачкай Паўлай Красавінай. Атрымалася гэта выпадкова: нехта з сяброў, ведаючы пра маё захапленне фатаграфіяй, папрасіў зрабіць некалькі яе здымкаў. Без усялякага энтузіязму адправіўся я ў «госці» да Красавінай.

Даведаўшыся аб мэце майго прыходу, Паўла Іванаўна трохі разгубілася. А тут яшчэ я папрасіў яе сесці за мальберт, каб адлюстраваць мастачку ў натуральных для яе абставінах. Пакуль ішло фатаграфаванне, на паперы з'явіўся букет кветак.

...Жанчына абмыла ў вадзе пэндзлі, схавала ў столік свае любімыя акварэльныя фарбы і выняла з шафы вялікі стос аркушаў.

— Паглядзіце, калі цікавіцеся, — прапанавала.

Ну, думаю, цяпер убачу кветкі самых розных колераў і адценняў... Але замест гэтага — вясковы калодзеж з жураўлём, сцяжынка, што бяжыць уздоўж Нарачы, дарагія сэрцу кожнага беларуса купалаўскія мясціны, запаветныя куточкі Мінска. А вось ужо іншая зямля — відаць, аднекуль з Сібіры прывезла мастачка гэтыя работы... Уражаны, я пачаў больш уважліва разглядаць акварэлі Паўлы Красавінай. Колькі іх тут? Сто, дзвесце?.. Было ў яе работах нешта такое, што прымусіла мяне хвалявацца, радавацца. Сціплыя пейзажы далі магчымасць па-новаму ўбачыць знаёмыя мясціны, адкрыць новае ў старым, звыклым. Гэта, на маю думку, зрабіць можа толькі пасапраўднаму здольны, таленавіты чалавек.

Многія з работ напісаны апошнім часам. Здавалася б, які сэнс занятаму чалавеку — Паўла Іванаўна працуе мастаком-афарміцелем на адным з мінскіх прадпрыемстваў—увесь свой вольны час аддаваць вандроўкам з эцюднікам? Грошай з гэтага яна, як быццам, не мае ніякіх, славы таксама. Лепшыя свае творы дорыць сябрам, знаёмым. Пастаянная ўдзельніца выставак самадзейных мастакоў...

Не пісаць Паўла Іванаўна проста не можа. Бо стан творчасці — яе натуральны, пастаянны стан. Мабыць таму яна і працуе ў самых розных умовах: у поездзе, пад дажджом, ля мора...

Вучыцца на мастака, як хацелася ў маладосці, не давялося. Жыццё распарадзілася па-свойму. Пайшла працаваць у майстэрні медыцынскага інстытута, дзе выраблялі наглядныя дапаможнікі. Там і спатрэбіліся яе мастакоўскія здольнасці.

У час аперацый рабіла каляровыя замалёўкі, якія друкаваліся ў падручніках па медыцыне.

Падгадаваўшы дачку, дзвюх пляменніц, яна паступае ў мастацкую студыю пры абласным Доме самадзейнай творчасці. Прага творчасці і імкненне як мага больш убачыць і зразумець былі настолькі моцнымі, што Паўла Іванаўна становіцца сапраўднай падарожніцай. Пабывала на Волзе, на Каўказе, у Прыбалтыцы, адкуль прывезла шмат цікавых нацюрмортаў, партрэтаў, пейзажаў. Аднак лепшых мясцін, як у роднай Беларусі, не знайшла.

Ад сябе ж зазначу, што акварэлі, зробленыя мастачкай на «мясцовым матэрыяле», выгадна адрозніваюцца ад іншых яе работ. Бо ў іх тонкае адчуванне роднай прыроды, добрае разуменне жыцця блізкіх ёй па духу людзей.

Хачу, каб і вы, паважаныя чытачы, трохі пазнаёміліся з творчасцю Паўлы Красавінай. Прапаную вашай увазе некалькі яе работ.

Іван КУРМАНОВІЧ.

НА ЗДЫМКАХ: акварэлі Паўлы КРАСАВІНАЙ «Заўсёды ў працы», «На таку», нацюрморт.

Фота аўтара.

УНІКАЛЬНЫ ЦЭНТР ДЛЯ ЗІМОВЫХ ВІДАЎ СПОРТУ ЧАКАЕ БІЯТЛАНІСТАЎ СВЕТУ

ГАСЦІННЫЯ РАЎБІЧЫ

7 лютага ў Раўбічах стартуе чэмпіянат свету па біятлону. Гэта за апошнія восем гадоў будуць трэція спаборніцтвы такога рангу пад Мінскам.

Два першыя чэмпіянаты (1974 і 1976 гады), на думку прэзідэнта Міжнароднага Саюза сучаснага пяцібор'я і біятлона С. Тофельта, прайшлі на высокім узроўні, узорна. І тым не менш спорткомплекс «Раўбічы» напярэдадні чарговага першынства перацярпеў вялікую рэканструкцыю. Навошта спатрэбілася траціць немалыя грошы і праводзіць такі вялікі аб'ём работ?

Па-першае, ставілася задача стварыць унікальны цэнтр не толькі для біятлона, але і для ўсіх зімовых відаў спорту. Па-другое, планавалася забяспечыць максімум выгод для гледачоў і спартсменаў. І па-трэцяе, самая галоўная мэта — пабудаваць буйны цэнтр для аздараўленчай работы з насельніцтвам і для адпачынку аматараў лыжных прагулак.

Паўмесяца засталося да стартаў першынства свету. Яшчэ можна ўбачыць у Раўбічах людзей у рабочых спяцоўках. Але будаўніцтва гэтага унікальнага комплексу ў асноўным закончана.

Пабудаваны трыбуны на 10 тысяч месц, удасканалена сістэма радыёўзмацнення і інфармацыі, абсталяваны аўтастаянкі для асабістага транспарту на 1 000 месц, расшырана зона гандлю.

Вельмі цікава і арыгінальна вырашана канструктарамі будаўніцтва так званай «Вёскі». Узведзена больш дзесятка прывабных драўляных домікаў у беларускім нацыянальным стылі. Тут будуць адпачываць спартсмены. Пасля чэмпіяната домікі будуць скарыстаны для адпачынку працоўных.

Прынамсі, кожнае спартыўнае збудаванне пасля першынства свету па біятлону як бы атрымае другое жыццё. Аўтастаянкі стануць плоскаснымі спартыўнымі пляцоўкамі, слаламная гара паслужыць для аматараў горналыжнага спорту і г. д.

Упершыню на чэмпіянаце свету па біятлону ў спорткомплексе «Раўбічы» будзе прыменена навінка. На светлавым табло пад мішэнямі гледачы змогуць убачыць меткасць кожнага выстралу. Пра гэта іх будзе інфармаваць электронная сістэма. Пакідаючы рубеж, спартсмены ўжо будуць ведаць вынік выступлення.

Сама траса ў Раўбічах па профілю складанасці і маляўнічасці не ўступае сусветным узорам. Галоўная вартасць яе — кругі размешчаны такім чынам, што вельмі зручна сачыць за ходам барацьбы ў лыжнай гонцы.

Сёлета ў Беларусі снегу як ніколі многа. Але ж... Усім вядомы тут капрызы прыроды. Таму гаспадары унікальнага комплексу набылі спецыяльную снежную гармату. Цяпер быў бы толькі мароз, а снег будзе.



Яшчэ не было поўнасцю закончана будаўніцтва комплексу, а спартсмены апробавалі трасу. Кандыдаты ў зборную СССР правялі ўсесаюзнае спаборніцтва. Па нядаўніх выступленнях можна амаль што беспамылкова назваць склад каманды Савецкага Саюза. Гэта алімпійскія чэмпіёны В. Барнашоў і В. Алікін, учарашнія юніёры П. Міларадаў, А. Зянкоў і В. Беларусаў. «Цвёрдым» кандыдатам у зборную краіны з'яўляецца і беларускі біятланіст Віктар Сямёнаў.

Гасцінныя Раўбічы чакаюць спартсменаў. Усё гатова да спаборніцтваў. Мяркуецца, што ў першынстве свету прымуць удзел больш як дваццаць краін.

НА ЗДЫМКАХ: гасцініца спартыўнага комплексу; у такіх доміках будуць адпачываць біятланісты ў перапынках паміж спаборніцтвамі.

Фота Г. УСЛАМАВА.

З НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ

А Ў ЛЕСЕ, ЛЕСЕ ДЫ НА ВЕРАСЕ



А ў лесе, лесе
Ды на верасе.
Вясна-красна
На ўвесь свет.

Малады там хлопчык
Ды валы пасе...
А яму дзяўчынка
Ды абед нясе...

Сядзьма разам, хлопчык,
Паабедайма...
А я па абедзе
Скажу табе дзіва...

Скажу табе дзіва
Найдзіўнейшае...
Гэтаю вясною
Пабярэмося...
Мужам і жаною
Застанемося.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордена Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ Беларусі.

Зак. 112